829 ДЗЁН АКУПАЦЫІ ГОМЕЛЯ

Гісторыя — гэта не пра мінулае, гісторыя — гэта пра будучыню, — нагадваюць арганізатары выстаўкі «829 дзён», якая зараз экспануецца ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі.

СЯРЭБРАНЫЯ ЗОРКІ ПАМЯЦІ

Кожны дзень, пражыты Гомелем пад акупацыяй фашыстаў, стаў выклікам голаду, холаду, смерці... Выпрабаванняў было зашмат. Напрыклад, магчымасць ці адмаўленне ад супрацоўніцтва з немцамі. Арганізатары вернісажу задавалі складаныя пытанні аўдыторыі, сярод якой было многа моладзі: а як вы асабіста зрабілі б у такой неадназначнай сітуацыі?

Немцы ўвайшлі ў Гомель у ноч з 19 на 20 жніўня 1941 года. Але ж Навабеліцу — зарэчны раён горада — яны змаглі захапіць толькі 24 жніўня. За гэты час адбываўся паступовы адыход Чырвонай Арміі на абаронны рубеж з боку вёскі Якубоўкі.

Насамрэч, ніхто з нас не можа ведаць, лепшыя ці горшыя якасці ён бы праявіў у экстрэмальных абставінах — пакуль яны не здарыліся. Аднак такія пытанні вядуць да разважанняў: не толькі пра асабісты лёс, але і пра адказнасць. За тых, хто побач, за месца, дзе нарадзіўся, за краіну, у якой вучышся, працуеш, нараджаеш дзяцей...

— Вайна пачынаецца не са стрэлаў, яна пачынаецца з ідэй, — гаворыць **старшы навуковы супрацоўнік гісторыка-краязнаўчага аддзела Вольга ГВОЗДЗЬ.** — У свеце жывуць розныя небяспечныя філасофіі. Менавіта таму давайце ўспомнім сваіх родных, якія супраціўляліся нацызму падчас Вялікай Айчыннай вайны. Не важна — на фронце, у партызанскім атрадзе ці ў акупацыі.

Знак успаміну — сярэбраная зорка. Сярод ахвотных прымацаваць яе на сцяну памяці ствараецца чарга. Яна Ясіноўская заканчвае абласны ліцэй і прысвяціла зорку свайму родзічу:

— Мой прадзед Іван Аляксандравіч Ісакс дайшоў да Берліна і потым аднаўляў Гомель пасля вайны. Мне пра яго расказвалі бабуля і маці.

Сваю зорку на імправізаваную сцяну замацоўвае і рэстаўратар Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Мікалай Лабанаў:

— Мая зорка прысвячаецца бацьку Мікалаю Канстанцінавічу, які ў гады вайны служыў у контрразведцы.

АБ'ЕКТЫЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ГІСТОРЫІ

Экспазіцыя «829 дзён» здаецца спачатку даволі сціплай, але ж кожную паперу, фотаздымак ці плакат гісторыкі прымушаюць гаварыць. І тады, напрыклад, высвятляецца, што ў Гомелі на сённяшняй плошчы Паўстання размяшчаўся лагер для перасыльных ваеннапалонных «Дулаг-121». За гады вайны ў ім загінула больш за 100 тысяч чалавек. Сярод экспанатаў — занатаваныя ўспаміны вязня гэтага лагера Паўла Губіна. Яму пашчасціла выжыць і збегчы.

На выстаўцы ёсць дакументы, якія сведчаць пра масавыя пахаванні мірных жыхароў і ваеннапалонных, яўрэйскія гета, пляцоўкі для расстрэлаў і паказальных пакаранняў... І шмат невядомых дагэтуль фотаздымкаў тых часоў. **Навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, аховы гісторыка-культурнай спадчыны Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Юрый ПАНКОЎ** больш за дзесяць гадоў таму зацікавіўся ваеннай гісторыяй горада над Сожам:

— Сёння ў Германіі на гарышчах многіх дамоў нашчадкі знаходзяць старыя фотаздымкі сваіх дзядоў і прадзедаў, якія ваявалі супраць Савецкага Саюза. Справа ў тым, што амаль кожны немец меў у тыя часы фотаапарат і здымаў усё, што лічыў неабходным пакінуць «на памяць». Цяпер такія фотакарткі прадаюцца на інтэрнэт-аўкцыёнах. Мне прыйшлося паўдзельнічаць у іх і заплаціць даволі вялікія сумы за асобныя фота. У калекцыі не адна сотня арыгінальных фотаздымкаў. Усе яны зняты звычайнымі салдатамі ў час акупацыі — з 1941 да 1943 года. Немцы здымалі абсалютна ўсё: архітэктуру, кампаніі сяброў, купанне ў Сожы, гандаль на цэнтральным рынку, лагер «Дулаг-121» і нават коцікаў. Аматарскія, а не прапагандысцкія здымкі тых часін — самыя аб'ектыўныя крыніцы гісторыі.

Гісторык Юрый ПАНКОЎ.

ФОТАЗНАХОДКІ

Юрый карпатліва працуе з маленечкімі фотакарткамі. Для прафесійнага гісторыка гэта не проста калекцыянаванне. Гэта — цікавая навуковая работа, якая дае ўяўленне пра рэальнае жыццё горада ў перыяд акупацыі:

— Мне прыходзілася дакладна вызначаць тыя месцы, дзе знята кожная фатаграфія. Злучаў выявы будынкаў і інфармацыю пра іх. Часам прыходзілася выходзіць на месца з картай нямецкай аэрафотаздымкі, каб дакладна вызначыць, дзе было зроблена фота.

Спачатку немцы збіраліся стаяць за Гомель насмерць, але ў лістападзе атрымалі загад яго пакінуць і тэрмінова адступілі. Сведкі ўспаміналі: «Мы прачнуліся раніцай 26 лістапада 1943 года — па вуліцы ідуць савецкія салдаты са штрафнога батальёна. Праз дзень пайшлі рэгулярныя часці Чырвонай Арміі».

У экспазіцыі палаца Румянцавых і Паскевічаў, згодна з вопісам, некалі знаходзілася скульптура «Тры грацыі» Антоніа Кановы. Юрый знайшоў фота з падобнай выявай, датаванае 1943 годам. А праз некаторы час музей набыў альбом з фотаздымкамі палаца ў 1911 годзе. Такім чынам было зроблена сапраўднае адкрыццё: стала зразумела, што твор мастацтва знаходзіўся ў Гомелі да самага адступлення немцаў. А гісторыкі змаглі пабачыць хоць бы на здымку адзін з самых прыгожых экспанатаў. На жаль, сама скульптура знойдзена не была. Між тым, сцвярджае Юрый Панкоў, адкрыцці яшчэ наперадзе, бо вельмі многа гарышчаў у Германіі яшчэ не разабраныя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Фрагмент экспазіцыі выстаўкі «829 дзён».

Салдат Перамогі

ІСЦІ І СТВАРАЦЬ

Два гады таму журналісты «Звязды» віншавалі з дзевяностапяцігоддзем даўняга сябра нашай газеты пісьменніка, ганаровага грамадзяніна горада Любань, ветэрана вайны і працы Івана Муравейку. На пытанне пра ўласныя планы ён з гумарам выказаў сваю галоўную мэту: «Іду на 100!»

Быць у руху, заўжды заставацца ў вірлівым рэчышчы творчай працы, грамадскай работы — яго крэда. А што датычыцца лічбы 100 гадоў — гэта таксама яго мэта, абгрунтаваная перш за ўсё бязмежнай любоўю да сваёй малой радзімы, жыццёвым аптымізмам, адданасцю працы пісьменніка.

Днямі я зрабіў гэтыя фотаздымкі. У пісьменніка ветэрана па-ранейшаму безліч творчых планаў, шмат часу прысвячае ён таму, каб здзейсніць

намечанае. Сваімі задумамі Іван Муравейка падзяліўся з метадыстам упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Любанскага райвыканкама Таццянай Кругленяй і старшынёй Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Святланай Быкавай.

З нагоды чарговага дня нараджэння найстарэйшага творцы ў пісьменніцкім саюзе (21 кастрычніка) звяздоўцы перадаюць яму пажаданні добрага здароўя, плёну ў творчасці, каб ён і далей упэўнена трымаў сваё пяро, як гэта бачна на фота!

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Памяць

У Элісце шануюць Беларусь-партызанку

Прозвішча калмыцкага паэта Міхаіла Хонінава — на слыху ў беларускага чытача. Адпаведна на слыху ў калмыцкага чытача — тэма повязі пісьменніка-партызана з Беларуссю.

Яшчэ раз пацвердзілася гэта і выданнем у Элісце навучальнага дапаможніка «Міхаіл Хонінаў: сто гадоў і адно жыццё», аўтарам і ўкладальнікам якога з'яўляецца дачка героя Вялікай Айчыннай вайны (за свае подзвігі на акупаванай фашыстамі зямлі Беларусі Міхаіл Ванькаевіч адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені) — кандыдат філалагічных навук Рыма Ханінава. У зборніку — шматлікія дакументальныя матэрыялы, мастацкія і літаратурнакрытычныя тэксты, істотная частка якіх носіць «беларускі характар». Дарэчы, і кандыдатам у члены Усесаюзнай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Міхаіл Хонінаў быў прыняты Клічаўскім падпольным райкамам КП(б)Б — у лютым 1944 года. Праўда, улічваючы тое, што калмыкаў у перыяд сталінскага культу асобы дэпартавалі ў Сібір, з партыяй на некаторы час адважнаму партызанскаму камандзіру давялося развітацца. Узнавілі яго ў шэрагах ленінцаў ужо пасля вяртання на радзіму, у Элісту, — у 1958 годзе. Пакручасты, драматычны лёс калмыцкага пісьменніка — ва ўспамінах, дакументальных сведчаннях, аўтабіяграфічных нарысах і іншых матэрыялах.

Міхаіл Хонінаў быў цесна звязаны з Беларуссю і ў пасляваенныя гады. У Мінску выйшлі дзве кнігі яго паэзіі ў перакладзе на беларускую мову. Назва адной з іх — «Хвоі і цюльпаны» — гучыць як паяднанне дзвюх старонак, паяднанне Беларусі і Калмыкіі. У Элісце пабачыў свет зборнік вершаў Янкі Купалы ў перакладах Міхаіла Хонінава на калмыцкую мову. Партызан і пісьменнік быў частым госцем у Мінску, на Магілёўшчыне, дзе партызаніў, сябраваў з беларускімі пісьменнікамі Максімам Танкам, Петрусём Броўкам, Васілём Быкавым, Аляксеем Пысіным, Рыгорам Барадуліным, шмат з кім з беларускіх літаратараў ліставаўся, рупіўся пра тое, каб іх голас чулі і ў Калмыкіі. Зараз бацькоўскія традыцыі сяброўства прадаўжае дачка — літаратуразнаўца Рыма Ханінава, аўтар многіх публікацый пра беларускую літаратуру.

Сяргей ШЫЧКО.